Вольга Рынкевіч

# Бібліятэкі, выдавецкія, кнігагандлёвыя арганізацыі: пошукі мадэлі ўзаемадзеяння

У рамках 13-й Мінскай міжнароднай кніжнай выставы, што праходзіла з 9 па 12 лютага 2006 г. у Нацыянальным выставачным цэнтры «БЕЛЭКСПА», упершыню адбыўся «Дзень бібліятэк». Адной са значных падзей гэтага дня стаў «круглы стол», арганізаваны Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі. Наспеўшыя праблемы камплектавання кніжных фондаў бібліятэк прадукцыяй беларускіх выдавецтваў абумовілі тэму «круглага стала»:«Библиотеки, издательские и книготорговые организации: модели успешного взаимодействия в формировании единого информационного пространства». Пад час мерапрыемства адбылася сустрэча дырэктараў абласных, рэспубліканскіх галіновых бібліятэк, загадчыкаў аддзелаў камплектавання, прадстаўнікоў кнігавыдавецкіх і кнігагандлёвых устаноў. Удзел у «круглым стале» прымалі госці з Расіі: М.Дз. Афанасьеў, дырэктар Дзяржаўнай публічнай гістарычнай бібліятэкі Расіі, А.А. Калганава, дырэктар Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі па мастацтву, Л.Я. Калінава, заг. аддзела камплектавання Усерасійскай дзяржаўнай бібліятэкі замежнай літаратуры, А.М. Гаўрылаў, галоўны рэдактар газеты «Книжное обозрение», прадстаўнікі кнігагандлёвых устаноў. Прадметам дэталёвага абмеркавання былі актуальныя для бібліятэк тэмы сённяшняга дня: бібліятэчная і выдавецкая палітыка ў Беларусі на сучасным этапе; стратэгія камплектавання бібліятэк Беларусі; узаемадзеянне выдаўцоў, пастаўшчыкоў, бібліятэкараў; электронны інфармацыйны асяродак і новыя магчымасці партнёрства бібліятэк кнігавыдавецкіх і кнігагандлёвых арганізацый.

Яны былі ўзняты ў выступленнях У.А. Шышкіна, намесніка начальніка ўпраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, А.С. Паўлавай, начальніка ўпраўлення выдавецкай дзейнасці і кніжнага гандлю Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Р.С. Матульскага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, У.А. Мачульскага, дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура». Выступоўцамі падкрэслівалася абавязковасць камплектавання сацыяльназначнай літаратурай, неабходнасць удасканальвання работы публічных бібліятэк па яе папулярызацыі. У дыскусіі, што разгарнулася практыкамі (Н.С. Чуева, дырэктар Мінскай абласной бібліятэкі, А.М. Васіленка, дырэктар Магілёўскай абласной бібліятэкі, Т.П. Данілюк, дырэктар Брэсцкай абласной бібліятэкі), былі азначаны самыя складаныя для іх праблемы ўзаемаадносін з выдавецтвамі, адна з іх – дастаўка літаратуры. Разуменне значнасці і гатоўнасць набыцця прадукцыі дзяржаўных выдавецтваў – гэта толькі адна састаўляючая ў выкананні даручэнняў кіраўніцтва краіны. Другая, і найбольш складаная, – дастаўка закупленай літаратуры ў бібліятэкі, асабліва ў самыя аддаленыя. Выдаўцам задаваліся пытанні, выказваліся прапановы. Для прысутных быў цікавым вопыт расійскіх калег, абагульнены ў выступленні М.Дз. Афанасьева. Прадстаўнікі бібліятэк атрымалі запрашэнне да супрацоўніцтва па падпісцы расійскіх газет і часопісаў ад І.В. Івановай, нам. генеральнага дырэктара ЗАТ «МК- Периодика», М.В. Івановай, вядучага менеджэра расійскага кнігагандлёвага прадпрыемства «Бібліяглобус», А.М. Гаўрылава. Свае прапановы па супрацоўніцтву ўнеслі Г.П. Пашкоў, дырэктар выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя», А.А. Менько, дырэктар цэнтральнага бібліятэчнага калектара. Галоўная выснова, да якой прыйшлі ўдзельнікі дыскусіі, – неабходнасць захаваць усе звёны ланцужка «выдавецтва – пастаўшчык – бібліятэка». Страта аднаго з іх непазбежна выкліча збой у рабоце астатніх. Было прынята рашэнне ў бліжэйшай будучыні правесці нараду дырэктараў абласных бібліятэк, кіраўнікоў дзяржаўных выдавецтваў і бібкалектараў з мэтай дэталёвай прапрацоўкі прапанаваных механізмаў супрацоўніцтва.

Прапануем Вашай увазе пералік сацыяльна значных выданняў 2006 года.

Summary

The author dwells on role of libraries in the field of publishing industry. The close up section at the 13 International Book Fair in Minsk was devoted to the issue of libraries, publishing and book trading organizations and their cooperation for the purposes of creating a common information space.

### Контактные телефоны издательств:

**«Беларусь»:** директор Столяров Александр Григорьевич – 203 04 38, отдел маркетинга – 203 89 51, 203 93 23.

**«Издательский дом «Беларуская навука»:** директор Сташкевич Александр Иосифович – 263 76 18, отдел маркетинга – 263 23 27.

**«Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі»:** главный редактор Пашков Геннадий Петрович – 284 06 00, отдел маркетинга – 284 06 08.

**«Вышэйшая школа»:** директор Нечай Александр Петрович – 222 54 15, отдел маркетинга – 203 67 38, 203 99 35.

**«Мастацкая літаратура»:** директор Мачульский Владислав Антонович – 203 48 09, отдел реализации – 203 58 09.

**РИУ «Литература и Искусство»:** и.о. директора Антонов Владимир Алексеевич – 284 85 25, отдел маркетинга – 284 79 65.

**Международный центр интеграционной информации. Общественный пресс-центр Дома прессы:** директор Белова Татьяна Владимировна – 292 42 93, редакционно-издательский отдел – 292 75 01.

### Члены координационного совета:

Начальник управления издательской деятельности и книжной торговли Министерства информации Республики Беларусь *Е.С. Павлова*

Начальник управления общего среднего образовани Министерства образования Республики Беларусь *В.К. Щербо*

Заместитель начальника управления учреждений культуры и народного творчества Министерства культуры Республики Беларусь *В.А. Шишкин*

# Перечень социально значимых изданий, запланированных к выпуску в I квартале 2006 года и рекомендуемых для обязательного приобретения библиотеками

*СОГЛАСОВАНО*
*Министр информации*
*Республики Беларусь*
*Русакевич В. В.*

*СОГЛАСОВАНО*
*Министр культуры*
*Республики Беларусь*
*Матвейчук В. Ф.*

*СОГЛАСОВАНО*
*Министр образования*
*Республики Беларусь*
*Радьков А. М.*

| № пп, автор, название | язык | объем, уч.-изд. л. | тираж, тыс. экз. | ориентировочная отпускная цена 1 экз., руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Издательство «Беларусь»** | | | | |
| 1. Сабина П. Беларусь живописная | рус, англ. | 17,0 | 2,0 | 15 175 |
| 2. Нясвіжскі фарны касцёл Божага Цела | бел., рус, англ. | 8,0 | 2,0 | 7 217 |
| 3. Мінскі Свята-Духаў кафедральны сабор | бел., рус, англ. | 8,0 | 2,0 | 7 217 |
| 4. Гродна. Фотаальбом | бел., рус., англ., пол. | 24,0 | 3,0 | 12 886 |
| **Издательский дом «Беларуская навука»** | | | | |
| 5. Танк М. Збор твораў у 13 т. Т. 1 | бел. | 19,0 | 2,0 | 5 956 |
| 6. Танк М. Збор твораў у 13 т. Т. 2 | бел. | 27,0 | 2,0 | 7 913 |
| 7. Маленко Л. Белорусский костюм 19-20 вв. | рус. | 10,0 | 1,0 | 11 080 |
| 8. Максімовіч В. Беларуская літаратура першай трэці XX ст. | бел. | 20,0 | 2,0 | 4 080 |
| **Издательство «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі»** | | | | |
| 9. Гісторыя Мінска | бел., рус. | 70,0 | 3.0 | 31 173 |
| 10. Карский Е. Беларусы. Т. 1. Серия «Памятники исторической мысли Беларуси» | рус., бел. | 70,0 | 2,0 | 28 467 |
| **Издательство «Мастацкая літаратура»** | | | | |
| 11*. Шамякін І. Збор твораў у 8 т. Т. 7 | бел. | 30,0 | 3,0 | 9 825 |
| 12. Галіноўская Н. Палёт з Карлсанам | бел. | 5,0 | 1,5 | 5 098 |
| 13. Асташонак А. Жоўты колер белага снегу | бел. | 18,0 | 1,5 | 10 630 |
| 14. Шніп В. Балада камянёў | бел. | 10,0 | 1,5 | 9 697 |
| 15. Павлов С. Осторожно: глобализм | рус. | 20,0 | 1,5 | 12 500 |
| 16. Брыль Я. Птушкі і гнёзды. Серыя «Беларуская проза XX стагоддзя» | бел. | 25,0 | 2,0 | 10 850 |
| 17. Растения. Очерки. Серия «Земля моя» | рус. | 5,0 | 4,0 | 5 019 |
| 18. Птицы. Очерки. Серия «Земля моя» | рус. | 5,0 | 4,0 | 5 019 |
| 19. Земнаводныя. Нарысы. Серыя «Зямля мая» | бел. | 5,0 | 3,0 | 3 338 |
| **Переиздания по заказу библиотек** | | | | |
| 20. Макаёнак А. Зацюканы апостал | бел. | 15,0 | 2,0 | 6 443 |
| 21. Мрый А. Запіскі Самсона Самасуя | бел. | 6,0 | 2,0 | 3 500 |
| 22. Купала Я. Тутэйшыя | бел. | 5,0 | 1,5 | 2 213 |
| 23. Маўр Я. Палескія рабінзоны | бел. | 11,0 | 1,5 | 5 279 |
| 24. Сяркоў І. Мы з Санькам у тыле ворага | бел. | 12,0 | 1,5 | 6 027 |
| **РИУ «Литература и Искусство»** | | | | |
| 25. Бондар Т. Гульня ў падкіднога | бел. | 17,5 | 2,0 | 8 199 |
| **Международный центр интеграционной информации. Общественный пресс-центр Дома прессы** | | | | |
| 26. Пресс-тур в глубинку. Альбом-книга | рус., бел. | 35,0 | 3,0 | 13 285 |
| 27. Республика Беларусь. 10 лет преобразований. Фотоальбом | рус., бел., англ. | 35,0 | 2,0 | 56 730 |

* 1,5 тыс. экземпляров издания Шамякина И. «Збор твораў. Т. 7» поставляется в публичные библиотеки за счет средств Министерства информации.